# Урачыста і весела хацімчане адзначылі Дзень Незалежнасці

Галоўнае свята беларускай дзяржаўнасці штогод адзначаецца 3 ліпеня. Дзень Незалежнасці для ўсіх беларусаў непарыўна звязаны з адной з найважнейшых падзей айчыннай гісторыі — вызваленнем сталіцы Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З кожным годам усё больш аддаляюцца трагічныя падзеі тых гадоў, з кожным годам застаецца ўсё менш жывых удзельнікаў і сведак той жорсткай і кровапралітнай вайны. У гэтым годзе спаўняецца 75 год з дня вызвалення Беларусі і 28 гадоў здабыцця маладой краінай свайго суверэнітэту. Для беларусаў гэтая дата з'яўляецца сімвалам нацыянальнага гонару, доблесці і славы, увасабленнем адзінства і згуртаванасці людзей. Нам, хацімчанам, асабліва прыемна ўсведамляць і памятаць, што вызваленне Беларусі пачыналася менавіта з нашай зямлі.





– З асаблівым хваляваннем зноў і зноў вяртаемся мы да трагічных старонак Вялікай Айчыннай вайны. Гэты святы для ўсіх нас дзень яшчэ раз нагадвае пра незаменныя страты, якія панёс народ Беларусі за час вайны. І яны адчуваюцца і сёння. Захоўваць святую памяць пра тыя гады – наш агульны абавязак, агульная адказнасць. Нізкі паклон і словы шчырай падзякі мы кажам ветэранам і ўдзельнікам вайны! Мы ніколі не забудзем, што менавіта вы

«Хацімчаначка», якая адразу знайшла станоўчыя водгукі сярод хацімчан (музыка Ігара Абушкевіча, мастацкага кіраўніка Забялышынскага СДК, словы – Вольгі Зайцавай, журналіста «ШК», выканала «Хацімчаначку» загадчык метадычным аддзелам раённага цэнтра культуры «Мір» Юлія Кавалёва).

Падчас свята неаднойчы гучала, што гэты дзень – не толькі нагода ўспомніць дзядоў і прадзедаў, якія прынеслі мір і сва-

і аддзела па адукацыі, спорту і турызму райвыканкама для ЦТДзіМ.

Усе мы маем жаданне бачыць Беларусь прыгожай і сучаснай дзяржавай, а нашу родную Хоцімшчыну – квітнеючым і камфортным для жыцця рэгіёнам краіны. І такія ўмовы для жыхароў нашай малой радзімы ствараюцца ў запланаваным аб'ёме. Так, напярэдадні свята ў гарадскім пасёлку пабудаваны і здадзены ў эксплуатацыю новы шматкватэрны дом па вуліцы

не далі паставіць наш народ на калені. Вы заклалі для нас трывалую падставу для мірных перамог. А мы сваімі паўсядзённымі справамі павінны даказваць, што эстафета герояў у надзейных руках. Мірная Беларусь – самы лепшы помнік загінуўшым і жывым. Тым, хто ў жорсткіх бітвах абараніў яе незалежнасць. Усё лепшае, што ёсць у нашым раёне – гэта ў першую чаргу, вынік працы яго жыхароў, карпатлівай працы ўсіх працаўнікоў Хоцімскага краю, якія заслугоўваюць велізарнай падзякі. Хай сёння, у галоўнае свята нашай дзяржавы, вашы сэрцы будуць поўныя гонара за сваю краіну. Давайце памятаць пра тое, што вышэйшая каштоўнасць, якую нам трэба зберагчы і перадаць наследнікам – гэта наша Радзіма. Хай усе нашы пачынанні будуць рэзультатыўнымі, а будучыня – светлай, – адзначыў старшыня райвыканкама Дзмітрый Рубан.

На ўрачыстым мітынгу са словамі шчырай удзячнасці за мірнае неба над беларускай зямлёй выступілі: Мікалай Тамашоў, старшыня раённага савета ветэранаў, Вадзім Белавусаў, намеснік начальніка адасобленай групы (Хоцімскага раёна) ваеннага камісарыята Клімавіцкага і Хоцімскага раёнаў па грамадзянскай абароне, а таксама Вольга Рэўсава, актывістка БРСМ. Тут жа ўпершыню прагучала прэм'ера песні аб малой радзіме боду на нашы землі і пакланіцца іх памяці, але яшчэ нагода для агульнай радасці і гонару за нашу маладую і квітнеючую краіну, за людзей, якія з'яўляюцца самым галоўным здабыткам прыбесядскага краю. Прыемным момантам свята стала цырымонія віншавання і ўзнагароджання, і гэта ў чарговы раз стала доказам таго, што сярод хацімчан шмат дастойных людзей, якія сваёй працай і дзейнасцю заслужылі самых высокіх слоў падзякі і пахвалы.

Так, Ордэнам Маці за выхаванне шасці дзяцей была адзначана Кацярына Сматрыцкая з гарадскога пасёлка. Падзячнымі лістамі райвыканкама за шматгадовую, добрасумленную працу, вялікі асабісты ўклад у развіццё рэгіёну быў адзначаны Віктар Дуняшэнка, дырэктар ДПЛ №16. Шэраг заслужаных узнагарод ад раённага выканаўчага камітэта, раённай арганізацыі «Белая Русь» атрымалі ў гэты дзень і працаўнікі сельскай гаспадаркі, сацыяльнай сферы, культуры, адукацыі, а таксама індывідуальныя прадпрымальнікі. Ганаровая грамата ад раённага Савета дэпутатаў была ўручана Мікалаю Маісеенка, ветэрану працы, члену савета Хоцімскага раённага савета ветэранаў. Таксама Прэзідыумам раённага Савета дэпутатаў накіраваны грашовыя сродкі на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы аховы здароўя «Хоцімская ЦРБ» Зялёнай. Ва ўрачыстай атмасферы ключы ад сваіх новых кватэр атрымалі першыя жыхары новабудоўлі: Таццяна Балыка, Вера Фацеенка, Марыя Чэвапалава, Алена Захаранка, Гэрмінэ Думікян, Кацярына Барысенка, Вольга Канюхава, Вольга Копелева, Наталля Козіна, Ірына Ярмохіна.

Пасля цырымоніі ўзнагароджвання хацімчан і гасцей нашага маляўнічага гарадка чакала яшчэ шмат сюрпрызаў: тэматычны канцэрт, прысвечаны Дню Незалежнасці, праца дзіцячых і маладзёжных пляцовак, пляцоўкі «Аквагрым», праца іграявых атракцыёнаў, выставы прац і майстар-класы майстроў раённага Дома рамёстваў, гандаль РайСТ і індывідуальных прадпрымальнікаў, праца тэматычных пляцовак культуры і арганізацый раёна, паказальнае выступленне Холі фарбаў і інш. Напрыканцы святочнага вечара хацімчане прынялі ўдзел у агульнарэспубліканскай акцыі «Праспяваем гімн разам». Карацей кажучы: адзначылі хацімчане галоўнае свята краіны ўрачыста і з добрым настроем.

Беларусь і Хоцімскі раён – наш агульны дом! Нам тут жыць і працаваць. Таму трэба прыкласці ўсе сілы і намаганні, каб усё задуманае спраўдзілася і кожны з нас мог горда сказаць: «Я – грамадзянін Рэспублікі Беларусь!».

**Вольга ЗАЙЦАВА**

**Зайцава, В.** Урачыста і весела хацімчане адзначылі Дзень Незалежнасці : [Ордэнам Маці ўзнагароджана Кацярына Сматрыцкая] / Вольга Зайцава // Шлях Кастрычніка. — 2019. — 6 ліпеня. — С. 6-7.